## НАШЕ НАСЛЕДИЕ

**С. Я. Новікаў**

# ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ГІСТОРЫКА М. П. КАСЦЮКА Ў МІНСКІМ ІНЯЗЕ (1981–1987) : ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

В статье автор продолжает исследование истории МГПИИЯ – МГЛУ на примере одного из важных этапов биографии будущего академика НАН Беларуси, доктора исторических наук, профессора Михаила Павловича Костюка. На основе малоизвестных документальных источников показано, что учебно-педагогическая деятельность ученого проходила в студенческой аудитории двух факультетов – английского и французского языков, где образовательный процесс по одной из дисциплин обеспечивала кафедра истории КПСС, на которой в течение почти семи лет работал М. П. Костюк. Сделан вывод, что время работы в Минском инязе стало одним из важных этапов его профессионального становления, завершившегося присвоением самого высокого педагогического ученого звания – профессора.

Вучэбна-педагагічная дзейнасць М. П. Касцюка, як вынікае з яго асабістага лістка па ўліку кадраў [1, арк. 2 адв.], пачалася ў Касадворскай васьмігодцы ў в. Баярская Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, куды ён быў размеркаваны пасля заканчэння Гродзенскага дзяржаўнага педінстытута імя Янкі Купалы ў 1963 годзе. Паспяховае паступленне на гісторыка-філалагічны факультэт ў 1958 г. і завяршэнне вучобы з адзнакай сталі ў значнай ступені вынікам яго стараннага навучання ў Навагрудскім педвучылішчы, куды ён паступіў у 1954 г. У 1964–1965 гг. дыпламаваны настаўнік сярэдняй школы Міхаіл Касцюк праходзіў вайсковую службу. З верасня 1965 г. узначальваў камітэт камсамола роднага інстытута, уваходзячы пры гэтым у склад бюро гаркама ЛКСМБ.

З моманту паступлення ў аспірантуру М. П. Касцюк пачынае пісаць сваю навуковую біяграфію: спачатку ступень кандыдата навук і крыху больш чым праз чвэрць веку атрымоўвае высокае званне акадэміка НАН Беларусі. Так, са снежня 1966 г. навучаўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, з якой быў адлічаны 8 верасня 1969 г. у сувязі з паспяховым завяршэннем навучання і напісаннем дысертацыі на тэму «Працоўная паўсядзённасць калгаснага сялянства БССР у перыяд перамогі і ўмацавання сацыялізму», абароненай у гэтым жа годзе. Далей працаваў на пасадах малодшага і старшага навуковага супрацоўніка, вучонага сакратара Інстытута гісторыі АН БССР і Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

У 1979 годзе абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Дзейнасць КПБ па ідэйна-палітычным выхаванні сялянства ў перыяд пабудовы сацыялізму (1926–1937 гг.)» [1, арк. 28]. Рашэннем ВАК СССР пры Савеце Міністраў СССР ад 29 жніўня 1980 г. Касцюку Міхаілу Паўлавічу была прысуджана вучоная ступень доктара гістарычных навук [1, арк. 8].

Новай старонкай яго вучэбна-педагагічнай дзейнасці з’яўлялася выкладчыцкая праца, якую вучоны сакратар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ доктар гістарычных навук распачаў у Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце замежных моў у другім семестры 1980–1981 навучальнага года. Як вынікае з асноўных біяграфічных даведнікаў [2, с. 143; 3, с. 161; 4, с. 156–157; 5, с. 80–83; 6], гэты перыяд яго асабістай біяграфіі не знайшоў адлюстравання ні ў адным з іх, нягледзячы на тое, што працягваўся амаль 7 гадоў, да 2 кастрычніка 1987 г., і пры гэтым вызначаўся адметнымі падзеямі [1, арк. 67]. Больш таго, на цяперашні час адсутнічаюць шматлікія дэталі прафесарскай эпапеі, невядомымі застаюцца тыя гістарычныя абставіны, якія суправаджалі гісторыка на жыццёвых этапах.

Першы з іх пачынаўся з афіцыйнага пісьма рэктара Мінскага іняза прафесара Н. Г. Красновай ад 13.01.1981 г., адрасаванага Міністру вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі М. М. Мяшкову. Паводле яго вынікала, што ў сувязі са смерцю персанальнага пенсіянера рэспубліканскага значэння М. Д. Лапцёнка, які да гэтага працаваў дацэнтам кафедры гісторыі КПСС, рэктар звяртаецца з просьбай аб дазволе прыняць доктара гістарычных навук М. П. Касцюка на ўмовах штатнага сумяшчальніцтва на 0,25 стаўкі дацэнта кафедры. На той час М. П. Касцюк працаваў вучоным сакратаром Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Міністр на наступны ж дзень, 14 студзеня 1981 г., наклаў сваю пісьмовую рэзалюцыю, адпаведна якой даваў дазвол станоўча вырашыць пытанне «у межах выдзеленых інстытуту адзінак штатнага сумяшчальніцтва» [1, арк. 5].

Заяву аб прыёме на работу на ўмовах штатнага сумяшчальніцтва на кафедру гісторыі КПСС вучоны сакратар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ доктар гістарычных навук М. П. Касцюк напісаў 27 студзеня 1981 года. Разам з заявай, завізіраванай загадчыкам кафедры доктарам гістарычных навук У. К. Коршукам, асабістая справа ўтрымлівала наступныя дакументы: 1. Пісьмо дырэкцыі і мясцовага камітэта Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ; 2. Асабісты лісток па ўліку кадраў; 3. Аўтабіяграфію; 4. Выпіску з працоўнай кніжкі; 5. Копію дыплома аб заканчэнні вну; 6. Копію дыплома доктара навук; 7. Копію атэстата старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «Гісторыя КПСС». Звернем увагу чытача на некаторыя са згаданых дакументаў не столькі ў плане знаёмства з гістарычным зместам, колькі з фактам удзелу ў лёсе М. П. Касцюка добра вядомых на той час людзей, якія займалі кіруючыя пасады і непасрэдна спрычыніліся да справы вучэбна-педагагічнага станаўлення знанага на той час навукоўцы. Напрыклад, у пісьме Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП Беларусі (філіял Інстытута марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС) на імя рэктара МДПІЗМ тав. Красновай, стаялі подпісы дырэктара Інстытута – на той час яшчэ кандыдата гістарычных навук Р. П. Платонава і старшыні мясцовага камітэта – кандыдата гістарычных навук У. М. Міхнюка. Гэтым афіцыйным зваротам яны пацвярджалі, што не супярэчаць працы ў Мінскім інязе на ўмовах штатнага сумяшчальніцтва (0,25 стаўкі) вучонага сакратара Інстытута доктара гістарычных навук Касцюка М. П. [1, арк. 6].

На падставе заявы Касцюка М. П., а таксама дазволу Міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі тав. Мяшкова М. М. і наяўнасці неабходных дакументаў рэктар Н. Г. Краснова аддала загад аб прыёме на работу доктара гістарычных навук Касцюка М. П. на пасаду дацэнта (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС на ўмовах штатнага сумяшчальніцтва з 9 лютага 1981 г. з акладам 80 рублёў у месяц [1, арк. 11]. 27 жніўня таго ж года М. П. Касцюк быў вымушаны зноў пісаць заяву аб прыёме на работу на ўмовах штатнага сумяшчальніцтва пасады дацэнта (0,25 стаўкі) па кафедры гісторыі КПСС у сувязі з тым, што адпаведна загаду № 132–К ад 31 ліпеня 1981 г. ён быў звольнены з гэтай пасады ў сувязі з заканчэннем працоўных адносін [1, арк. 13]. Адзначым, што на той момант заяўляльнік па асноўным месцы працы займаў ужо іншую пасаду – намесніка дырэктара па навуковай працы Інстытута гісторыі АН БССР. У пісьме на імя рэктара Красновай Н. Г. кіраўнікі акадэмічнай установы – дырэктар Інстытута гісторыі член-карэспандэнт АН БССР Петрыкаў М. Ц. і старшыня мясцовага камітэту кандыдат гістарычных навук Казлоўская А. Я. – не былі супраць работы Касцюка М. П. на ўмовах штатнага сумяшчальніцтва [1, арк. 14]. Сярод іменаў, з удзелам якіх прымаліся рашэнні ў гэтым і іншых навучальных гадах, можна згадаць намесніка акадэміка-сакратара аддзялення гуманітарных навук АН БССР члена-карэспандэнта Д. І. Шыраканава і вучонага сакратара кандыдата гістарычных навук У. Е. Снапкоўскага [1, арк. 20].

З дакументаў, выяўленых у фондах НАРБ і захаваных у асабістай справе, вынікае, што доктар гістарычных навук старшы навуковы супрацоўнік па спецыяльнасці «Гісторыя КПСС» Касцюк М. П. у вольны ад асноўнай работы час чытаў у Мінскім інязе на тыдзень 1 лекцыю і праводзіў семінарскія заняткі са студэнтамі факультэтаў англійскай і французскай моў [1, арк. 23]. Аб тым, у якіх абставінах прыходзілася працаваць у студэнцкай аўдыторыі, можна даведацца з пастановы Бюро прэзідыума АН БССР ад 14 верасня 1984 г. за № 233, паводле якой намесніку дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР па навуковай працы доктару гістарычных навук Касцюку М. П. даваўся дазвол працаваць на ўмовах сумяшчальніцтва ў 1984–1985 навучальным годзе ў МДПІЗМ на 0,25 стаўкі прафесара ў непрацоўны час. Тады як фактычна час асноўнай працы ў акадэмічнай установе працягваўся з 8.30 да 17.45 штодня. Пра гэта паведамлялася ў пісьме за подпісам Прэзідэнта Акадэміі навук БССР акадэміка М. А. Барысевіча і галоўнага вучонага сакратара Прэзідыума АН БССР акадэміка АН БССР У. А. Піліповіча. Як ні дзіўна, але якраз такі высокі адказ быў дадзены на хадайніцтва рэктара мінскага іняза Красновай Н. Г. аб дазволе працаваць на ўмовах сумяшчальніцтва Касцюку М. П. у 1884–1985 навучальным годзе [1, арк. 24].

Новым важным этапам у вучэбна-педагагічнай дзейнасці М. П. Касцюка можна назваць перыяд, які пачаўся з 4 студзеня 1985 г., калі ён звярнуўся на імя рэктара з заявай, у якой прасіў дазволу прыняць удзел у конкурсе на замяшчэнне вакантнай пасады дацэнта (0,25 стаўкі) [1, арк. 26], і да

25 студзеня – даты тайнага галасавання Вучонага савета інстытута па ўнесенай у бюлетэнь кандыдатуры доктара гістарычных навук Касцюка Міхаіла Паўлавіча і яго абрання на гэтую пасаду.

У сувязі з абраннем па конкурсе на адрас вучонага савета Мінскага іняза была падрыхтавана характарыстыка аб навуковай і грамадскай дзейнасці намесніка дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР па навуковай працы Касцюка М. П. Характарыстыка была зацверджана на пасяджэнні партбюро Інстытута гісторыі АН БССР (пратакол № 8 ад 24 снежня 1984 г.) і заверана трыма подпісамі адпаведна: дырэктара Інстытута члена-карэспандэнта АН БССР П. Ц. Петрыкава, сакратара партыйнага бюро доктара гістарычных навук В. А. Палуяна, старшыні прафсаюзнага камітэта доктара гістарычных навук А. М. Сарокіна [1, арк. 28 адв.].

У службовай характарыстыцы адзначалася, што вучоны плённа працаваў над даследаваннем важных праблем сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку аб гісторыі станаўлення сялянства і рабочага класа рэспублікі. Ім апублікавана каля 40 наву-ковых прац. Сярод іх манаграфія «Ідэйна-палітычнае выхаванне сялянства. З вопыту работы Кампартыі Беларусі ў перыяд будаўніцтва сацыялізму. 1926–1937 гг.» і вялікі раздзел у абагульняючай працы «Перамога калгаснага строю ў Беларускай ССР». Навуковыя працы Касцюка М. П. атрымалі станоўчую ацэнку ў саюзным і рэспубліканскім друку. Яго публікацыі, у тым ліку ў саюзных выданнях, уносяць значны ўклад у вывучэнне працоўнай актыўнасці сялянства ва ўмовах пабудовы і ўмацавання сацыялізму, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгаснага строю ў працэсе пераўтварэння прыватнаўласніцкай ідэалогіі сялянства ў сацыялістычную. Касцюк М. П. – адзін з кіраўнікоў рэспубліканскай комплекснай праграмы «Гісторыя сялянства Беларусі», якая выконвалася ў Інстытуце гісторыі. З’яўляўся сябрам рэдкалегіі і галоўным рэдактарам другога тома 4-томнага выдання «Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР». Удзельнічаў у падрыхтоўцы навуковых кадраў, у тым ліку кіраваў падрыхтоўкай аспірантаў [1, арк. 28–28 адв.].

Як намеснік дырэктара інстытута па навуковай працы М. П. Касцюк шмат увагі надаваў далейшаму ўдасканаленню арганізацыі навуковых даследаванняў, павышэнню іх навукова-тэарэтычнага ўзроўню, росту навуковай кваліфікацыі кадраў. Сістэматычна павышаў свой ідэйна-тэарэтычны і прафесійны ўзровень. Прымаў актыўны ўдзел у саюзных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях і сесіях.

Актыўна ўдзельнічаў ў грамадскай рабоце. З’яўляўся членам партыйнага бюро інстытута, кіраўніком метадалагічнага семінара «Праблемы камуністычнага будаўніцтва і абароны сацыялістычнай Айчыны», членам спецыялізаванага савета па абароне доктарскіх дысертацый пры Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ, бібліятэчнага савета АН БССР, аргкамітэта рэспубліканскага конкурсу маладых вучоных па грамадскіх навуках, узначальваў экспертна-праверачную камісію па адборы дакументаў на дзяржаўнае захоўванне ў АН БССР, выконваў іншыя грамадскія даручэнні. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Службовая характарыстыка з асноўнага месца працы з'яўлялася толькі адным з важных дакументаў, якія рыхтаваліся на этапе падрыхтоўкі М. П. Касцюка да прадстаўлення на савеце МДПІЗМ. Перад гэтым пытанне было абмеркавана на пасяджэнні кафедры гісторыі КПСС 15 студзеня 1985 г., падчас якога давалася ацэнка вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай рабоце выкладчыка, а таксама зацвярджалася матываванае заключэнне кафедры для ўдзелу конкурсе. У парадку дня яно разглядалася толькі пад нумарам 6 і гучала як прадстаўленне Касцюка М. П. на пасаду дацэнта (0,25 стаўкі) кафедры [6, арк. 99].

З пратакола кафедры вынікае, што ў ходзе абмеркавання пытання аб вылучэнні М. П. Касцюка на пасаду дацэнта кафедры (0,25 стаўкі) яго кандыдатуру рэкамендавалі 5 выкладчыкаў, у тым ліку: 1 – загадчык кафедры доктар гістарычных навук, прафесар М. С. Варабей і 4 дацэнты – кандыдаты гістарычных навук М. Я. Мурашка, Б. І. Загорскі, А. А. Віхраў, Э. А. Ліпецкі. У сваіх выступленнях яны адзначылі, што ўжо 5 гадоў у студэнцкай аўдыторыі факультэта англійскай мовы самааддана працуе не толькі таленавіты беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, але і выдатны выкладчык. Яго лекцыі і семінарскія заняткі, якія наведвалі выкладчыкі кафедры, праходзяць на высокім ідэйна-тэарэтычным і метадычным узроўні; лектар прыцягвае ўвагу студэнтаў шырокім выкарыстаннем краязнаўчага матэрыялу, розных фактаў з гісторыі Беларусі. М. П. Касцюк правёў адкрытую лекцыю на тэму «Барацьба партыі за развіццё сацыялістычнай рэвалюцыі і ўмацаванне Савецкай улады (кастрычнік 1917–1918 гг.)», якая атрымала высокую ацэнку на пасяджэнні. Апроч таго, гісторык падрыхтаваў для абмеркавання тэкст лекцыі на тэму «Ленінская тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі» [6, арк. 102]. Адзначаўся актыўны ўдзел навукоўца ў выкананні кафедральнай тэмы, кіраўніцтве навукова-даследчай работай студэнтаў. За час працы ён заваяваў аўтарытэт у выкладчыкаў кафедры і студэнтаў інстытута. Вынікам абмеркавання стала пастанова, падтрыманая аднагалосна, аб рэкамендацыі намесніка дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР, доктара гістарычных навук, старшага навуковага супрацоўніка Міхаіла Паўлавіча Касцюка для абрання на пасаду дацэнта (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС [6, арк. 103].

У матываваным заключэнні, зацверджаным на пасяджэнні кафедры гісторыі КПСС 15 студзеня 1985 г., адзначалася, што М. П. Касцюк працуе на кафедры ў якасці штатнага сумяшчальніка на пасадзе дацэнта з лютага 1981 года. Вядзе ўсе віды вучэбных заняткаў: чытае лекцыі, праводзіць семінарскія заняткі і кансультацыі, прымае залікі і экзамены ў студэнтаў. Апроч таго, прымае кандыдацкія экзамены ў аспірантаў па марксісцка-ленінскай філасофіі. Вучэбныя заняткі праводзіць на высокім ідэйна-тэарэтычным узроўні, дабіваецца глыбокага вывучэння праграмнага матэрыялу. Укараняе ў вучэбны працэс новыя дасягненні гісторыка-партыйнай навукі. Паказчыкі паспяховасці студэнта адпавядаюць агульнакафедральнаму ўзроўню. Пастаянна працуе над удасканаленнем тэкставых матэрыялаў лекцыі,

імкнецца надаць ім праблемны характар. Праводзіць адкрытыя лекцыі, наведвае заняткі калег па кафедры. Рыхтуе метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні выкладчыкамі дыдактычных матэрыялаў у навучальным працэсе [7, арк. 135]. Кіруе вучэбна-даследчай работай студэнтаў, падрыхтоўкай выступленняў студэнтаў на студэнцкіх канферэнцыях. Прымае ўдзел у выкананні дзяржбюджэтнай тэмы, рыхтуе адну з яе частак «Рабочы клас і сацыяльнае развіццё савецкага грамадства». У якасці навуковага рэдактара працуе над рукапісам манаграфіі «Дзейнасць КПБ па падборы і выхаванні кіруючых калгасных кадраў (1944–1965 гг.)», падрыхтаванай пры жыцці дацэнтам В. Р. Доркіным. Прадстаўленне завяршалася агульным вывадам, адпаведна якому кафедра рэкамендавала М. П. Касцюка да абрання на пасаду дацэнта (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС як штатнага сумяшчальніка [6, арк. 104–105].

Камісія МДПІЗМ па замяшчэнні пасад прафесарска-выкладчыцкага складу пры разглядзе дакументаў М. П. Касцюка, які ўдзельнічаў у конкурсе на замяшчэнне вакантнай пасады дацэнта (0,25 стаўкі), аднагалосна рэкамендавала савету інстытута абраць доктара гістарычных навук М. П. Касцюка на пасаду дацэнта (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПССС як штатнага сумяшчальніка. Заўважым, што ў ролі старшыні камісіі выступаў прарэктар па навуковай працы, выпускнік матэматычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага педінстытута імя Я. Купалы, кандыдат педагагічных навук Л. Н. Ціханаў [1, арк. 37].

Паводле выпіскі з пратакола № 9 ад 25 студзеня 1985 г. і ў адпаведнасці з вынікамі тайнага галасавання вучонага савета МДПІЗМ ад 25 студзеня 1985 г. была зацверджана пастанова аб абранні Касцюка Міхаіла Паўлавіча на пасаду дацэнта (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС [1, арк. 39]. Загадам рэктара № 34–К ад 31 студзеня 1985 г. было зацверджана гэтае рашэнне.

Заключным этапам у вучэбна-педагагічнай дзейнасці для М. П. Касцюка стаў амаль двухгадовы перыяд, які пачаўся з 25 красавіка 1985 г., калі рэктарат Мінскага іняза аб'яўляў конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады прафесара (0,25 стаўкі) па кафедры гісторыі КПСС, і да прысваення ВАК СССР доктару гістарычных навук вучонага звання прафесара ў сакавіку 1987 года. У заяве доктара гістарычных навук М. П. Касцюка, напісанай на наступны дзень пасля публікацыі аб'явы у гарадской газеце «Вечерний Минск» [9, с. 4] на імя рэктара, прафесара Н. Г. Красновай, выказвалася просьба ад дазволе на ўдзел у конкурсе. Да яе дадаваліся два дакументы – асабісты лісток па ўліку кадраў і характарыстыка, падпісаная дырэктарам Інстытута гісторыі АН БССР членам-карэспандэнтам П. Ц. Петрыкавым, сакратаром партыйнага бюро доктарам гістарычных навук В. А. Палуянам і старшынёй прафсаюзнага камітэта А. М. Сарокіным 26 красавіка 1985 г. [1, арк. 45–45 адв.].

Гістарычна важнае для М. П. Касцюка пасяджэнне кафедры гісторыі КПСС, у якім прымалі ўдзел 14 чалавек, у тым ліку 2 доктары гістарычных навук (загадчык кафедры прафесар М. С. Варабей, М. П. Касцюк), 4 дацэнты – кандыдаты гістарычных навук (А. А. Віхраў, Б. І. Загорскі, Э. А. Ліпецкі,

П. Я. Мурашка), 1 старшы выкладчык (А. Д. Калеснікаў), асістэнт В. І. Курганаў, 2 выкладчыкі (І. С. Пятроўскі і Я. Г. Цыганкова) і 4 выкладчыкі гісторыі СССР (С. П. Кубека, С. М. Лабаценка, С. Я. Новікаў, С. У. Сонкін), разглядала пытанне аб абранні М. П. Касцюка на вакантную пасаду прафесара (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС МДПІЗМ. Пасяджэнне адбылося 3 чэрвеня 1985 г. [9, арк. 165–167].

Адзначым, што першым пытаннем у парадку дня пасяджэння стаяла абмеркаванне доктарскай дысертацыі прарэктара па навуковай працы кандыдата педагагічных навук Л. Н. Ціханава «Руководство КПСС коммунистическим воспитанием учащейся молодежи в условиях развитого социализма (на материалах партийных организаций Белоруссии)», у якім прымаў удзел доктар гістарычных навук М. П. Касцюк.

Толькі пасля гэтага разглядалася другое пытанне, падчас якога была заслухана і абмеркавана справаздача дацэнта М. П. Касцюка аб вучэбна-метадычнай, палітыка-выхаваўчай, навукова-даследчай рабоце і павышэнні кваліфікацыі ў сувязі з абраннем на вакантную пасаду прафесара (0,25 стаўкі). Гэтая справаздача мае надзвычай важнае значэнне для ўсіх тых, хто за кожным словам, радком выступлення ўзгадае зноў для сябе гукі яго фанетычнага маўлення, добрае веданне беларускай мовы і паспрабуе намаляваць вобраз чалавека, які ўжо пакінуў гэты свет і якога мы ведалі ў вучэбнай аўдыторыі, за лекцыйнай трыбунай, выкладчыцкім сталом у семінарскай аўдыторыі ці падчас асабістай размовы.

Як вынікае са справаздачы, М. П. Касцюк на працягу пяці гадоў працы ў Мінскім інязе чытаў лекцыйны курс і вёў семінарскія заняткі на першым курсе факультэтаў англійскай і французскай моў. У працы шырока выкарыстоўваў творы класікаў марксізму-ленінізму, партыйныя дакументы, працы кіраўнікоў КПСС і Савецкай дзяржавы, міжнароднага камуністычнага, рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху. Шырока ўжываў навуковую і мастацкую літаратуру, матэрыялы перыядычнага друку, сродкі нагляднасці. Кіраваў навукова-даследчай работай студэнтаў. Падрыхтаваў шэраг тэкстаў лекцый, адна з якіх была абмеркавана і ўхвалена кафедрай. Праводзіў адкрытыя заняткі, наведваў заняткі іншых выкладчыкаў. Прымаў залікі і экзамены ў студэнтаў. У працэсе заняткаў звяртаў увагу на тое, каб матэрыял мог зацікавіць студэнтаў, а не насіў чыста акадэмічны характар. Імкнуўся праводзіць семінары з выкарыстаннем актыўных форм дыялогу са студэнтамі.

Штогод з'яўляўся членам камісіі па прыёме экзаменаў кандыдацкага мінімуму па дыялектычным і гістарычным матэрыялізме. У 1982–1984 гг. быў старшынёй дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі на завочным аддзяленні гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

За справаздачны перыяд апублікаваў 15 работ, 4 з іх – у саюзных выданнях. Сярод іх артыкул «Фарміраванне калектывісцкіх ідэй у беларускай вёсцы (1918–1929 гг.)» у часопісе «Вопросы истории» (1983, № 11). Выступаў на пасяджэнні кафедры з навуковым дакладам на тэму «Асвятленне ленінскай аграрнай палітыкі ў сучаснай савецкай гістарыяграфіі».

Працуючы ў МДПІЗМ з'яўляўся членам Галоўнай рэдакцыйнай калегіі буйной абагульняючай працы «Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР» у 4-х тамах, адказным рэдактарам і адным з аўтараў другога тома «Рабочы клас БССР у гады Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудовы сацыялізму (1917–1937 гг.)» (Мінск, 1985, 38 друк. арк.). У той жа час у друку знаходзілася манаграфія «Працоўны ўклад сялянства ў перамогу і ўмацаванне сацыялізму. 1926–1941 гг. (на матэрыялах Беларускай ССР)». Яе выданне было запланавана на 1986 год.

Ажыццяўляў навуковае кіраўніцтва аспірантамі і саіскальнікамі. Адзін з іх паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. За справаздачны перыяд не раз выступаў у якасці афіцыйнага апанента на абароне адной доктарскай і 8 кандыдацкіх дысертацый. З'яўляўся членам двух спецыялізаваных саветаў па абароне дысертацый на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук.

Выступаў з дакладамі на навуковых канферэнцыях, сесіях, сімпозіумах, у тым ліку на XIX сесіі Усесаюзнага сімпозіума па вывучэнні праблем аграрнай гісторыі (г. Уфа, 1982 г.). Рэцэнзаваў рукапісы трох манаграфій.

Уваходзіў у склад секцыі метадычнага савета па марксісцка-ленінскай адукацыі Першамайскага РК КПБ г. Мінска. З'яўляўся членам партыйнага бюро Інстытута гісторыі АН БССР, кіраўніком метадалагічнага семінара «Праблемы камуністычнага будаўніцтва і абароны сацыялістычнай Айчыны», сябрам бібліятэчнага савета АН БССР, аргкамітэта рэспубліканскага конкурсу маладых вучоных па грамадскіх навуках, узначальваў экспертна-праверачную камісію АН БССР па адборы дакументаў на дзяржаўнае захоўванне.

Удзельнічаў у падрыхтоўцы навуковых выступленняў вучэбнай групы студэнтаў факультэта англійскай мовы на канферэнцыі, прысвечанай 40-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне [10, арк. 183; 11, арк. 184–185].

Падчас абмеркавання справаздачы М. П. Касцюка на пасяджэнні кафедры выступілі М. С. Варабей, А. А. Віхраў, А. Д. Калеснікаў, Б. І. Загорскі, М. Я. Мурашка, Э. А. Ліпецкі, якія рэкамендавалі яго кандыдатуру для абрання на вакантную пасаду прафесара (0,25 стаўкі) па кафедры гісторыі КПСС. Па выніках абмеркавання справаздачы і адказаў на пастаўленыя пытанні адбылося адкрытае галасаванне: за – 14, супраць – няма, устрымаліся – няма. Такім чынам, аднагалосна зацвярджалася пастанова аб рэкамендацыі доктара гістарычных навук дацэнта М. П. Касцюка да абрання на вакантную пасаду прафесара (0, 25 стаўкі) па кафедры гісторыі КПСС. У матываваным заключэнні, зацверджаным пратаколам № 13 ад 3 чэрвеня 1985 г., кафедра на пасяджэнні давала высокую ацэнку вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і грамадскай рабоце М. П. Касцюка і рэкамендавала яго да абрання на штатную пасаду прафесара (0,25 стаўкі). Заўважым, што подпіс пад дакументамі паставіў в. а. загадчыка кафедры дацэнт Э. А. Ліпецкі [12, арк. 186–188].

На пасяджэнні камісіі па замяшчэнні вакантных пасад прафесарска-выкладчыцкага складу МДПІЗМ, якое адбылося 21 чэрвеня 1985 г., былі разгледжаны дакументы па кандыдатуры М. П. Касцюка. Камісія адзначыла, што саіскальнікам цягам справаздачнага перыяду былі выкананы ўсе віды вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і грамадскай работы, пасля чаго аднагалосна рэкамендавала Савету інстытута кандыдатуру доктара гістарычных навук Касцюка Міхаіла Паўлавіча для абрання на вакантную пасаду прафесара (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС. 28 чэрвеня 1985 г. адбылося пасяджэнне вучонага савета інстытута, на якім па выніках тайнага галасавання М. П. Касцюк быў аднагалосна абраны на вакантную пасаду прафесара (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС. Паводле пратакола № 11 пасяджэння падліковай камісіі ад 28.06.1985 г. вучоны савет зацвердзіў вынікі тайнага галасавання і абраў Касцюка Міхаіла Паўлавіча на пасаду прафесара (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС [13, арк. 140].

У гэтай сувязі 1 ліпеня 1985 г. доктар гістарычных навук піша заяву на імя рэктара аб залічэнні яго з новага вучэбнага году на пасаду прафесара (0, 25 стаўкі) як абранага на конкурснай аснове [1, арк. 55]. З 4 ліпеня загадам рэктара № 193-К зацвярджалася рашэнне савета аб выбранні Касцюка М. П. на пасаду прафесара кафедры (0,25 стаўкі). 11 ліпеня 1985 г. паводле загада № 203-К доктар гістарычных навук Касцюк М. П. пераводзіўся на пасаду прафесара (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС з 1.09.1985 г. з акладам 80 рублёў у месяц у сувязі з абраннем па конкурсе [1, арк. 57].

У канцы ліпеня М. П. Касцюк піша заяву на імя рэктара аб дазволе працягнуць работу на ўмовах сумяшчальніцтва на пасадзе прафесара (0,25 стаўкі) кафедры гісторыі КПСС. У якасці дадатку быў прыкладзены дазвол бюро прэзідыума АН БСР ад 16 ліпеня 1985 г. за подпісам віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук БССР акадэміка АН БССР А. С. Махнача. У афіцыйнай паперы намесніку дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР доктару гістарычных навук Касцюку Міхаілу Паўлавічу дазвалялася працаваць на ўмовах сумяшчальніцтва ў 1985–1986 навучальным годзе на 0,25 стаўкі прафесара ў непрацоўны час. Пры гэтым згадваўся час асноўнай работы ў Інстытуце з 8.30 да 17.45 гадзін штодня [1, арк. 59]. Падобная афіцыйная папера за подпісамі віцэ-прэзідэнта АН БССР акадэміка А. С. Дзмітрыева і старшыні аб’яднанага камітэту прафсаюза АН БССР доктара філалагічных навук А. І. Падлужнага была накіравана на імя рэктара МДПІЗМ прафесара Красновай Н. Г. Такая ж папера была ў апошні раз адпраўлена 14 кастрычніка 1986 г. на прадмет хадайніцтва аб дазволе працаваць на ўмовах сумяшчальніцтва на пасадзе прафесара (0,25 стаўкі) ў новым 1986/1987 навучальным годзе намесніку дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР доктару гістарычных навук Касцюку Міхаілу Паўлавічу [1, арк. 64].

Паводле загаду ад 2 кастрычніка 1987 г. доктар гістарычных навук, прафесар (званне прафесара прысвоена ВАКам СССР па кафедры гісторыі КПСС 20 сакавіка 1987 г.) Касцюк М. П. быў звольнены з пасады прафесара кафедры гісторыі КПСС (штатны сумяшчальнік на 0,25 стаўкі) з 1 верасня 1987 г. у сувязі з заканчэннем тэрміну працоўнага дагавора [1, арк. 67].

Такім чынам, перыяд працы доктара гістарычных навук М. П. Касцюка ў Мінскім інязе цягам цэлых сямі гадоў з'яўляўся для будучага акадэміка адным з важных этапаў прафесійнага станаўлення, які быў паспяхова завершаны атрыманнем самага высокага педагагічнага звання – прафесара.

## ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ


1. Бягучы архіў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта (Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў). – Воп. 5. – Адз. зах. 4532. – Арк. 62–63.
2. Касцюк Міхаіл Паўлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 4: Кадэты – Ляшчэня / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1997.
3. Касцюк Міхаіл Паўлавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 8: Канто – Кулі / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1999. – С. 161.
4. Касцюк Міхаіл Паўлавіч // Историки Беларуси в начале XXI столетия : библиогр. справ. / Г. В. Корзенко. – Минск : Белорус. наука, 2007. – С. 156–157.
5. Касцюк Міхаіл Паўлавіч // Институт истории Национальной академии наук Беларуси в лицах (1929–2008 гг.): библиогр. справ. / Г. В. Корзенко [и др.]; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Белорус. наука, 2008. – С. 80–83.
6. Касцюк Міхаіл Паўлавіч [Электронны рэсурс]. – 2020. – Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki/Міхаіл_Паўлавіч_Касцюк. – Дата доступу : 19.02.2020.
7. Протокол № 13 заседания кафедры истории КПСС МГПИИЯ от 16 апр. 1984 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 1187. – Арк. 135–141.
8. Протокол № 13 заседания кафедры истории КПСС МГПИИЯ от 15 янв. 1985 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь – далей НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1277. Арк. 99–103.
9. Ректорат объявляет конкурс // Вечерний Минск. – № 96 от 25.04.1985 г.
10. Протокол № 13 заседания кафедры истории КПСС МГПИИЯ от 3 июня 1985 г. // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1277. Арк. 159–188.
11. Отчет доктора исторических наук доцента Костюка М. П. о работе на кафедре истории КПСС МГПИИЯ с февраля 1981 по июнь 1985 г. // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1277. Арк. 184–185.
12. Мотивированное заключение кафедры истории КПСС об учебной, учебно-методической, научно-исследовательской и общественной работе доцента Костюка М. П. за период с февраля 1981 по июнь 1985 г. // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1277. Арк. 186–188.
13. Протокол № 17 заседания Совета Минского государственного педагогического института иностранных языков от 28 июня 1985 г. // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1248. Арк. 121–146.


*Поступила в редакцию 01.04.2020*